# ЮЗЭФА МАЦКЕВІЧ

Нарадзілася Юзэфа Фларыянаўна Мацкевіч 27 ліпеня 1911 г. у в. Ухлё Лепельскага павета Віцебскай губерні (зараз Чашніцкі раён Віцебскай вобласці) у беднай сялянскай сям'і (бацька – Іосіф Антонавіч Мацкевіч, маці – Юзэфа Мацкевіч). Бацькі паходзілі з Глыбоччыны, але цяжкае батрацкае жыццё шматдзетнай сям'і (было 9 дзяцей!) вымушала да частых змен месца жыхарства – працавалі па найме ў памешчыкаў. У 1920 г. памерла маці, а ў 1927 г. – і бацька, непаўналетняя дзяўчынка засталася сіратой. Яе ўзяў на выхаванне і ўтрыманне старэйшы брат Казімір, які ўжо працаваў на той час рабочым Шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак». У Шклове яна паспяхова скончыла сямігодку і паступіла ў Магілёўскі педагагічны тэхнікум (1929–1931 гг.). Тут яна сустрэла сваё каханне, Кірылу Мацвеевіча Ганчарова, такога ж студэнта, як і сама. Яны пажаніліся. У 1931 г. па заканчэнні тэхнікума Юзэфа Мацкевіч паехала працаваць настаўніцай пачатковых класаў у в. Гулькі Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці, дзе два гады вучыла грамаце мясцовых дзетак.

Час напружанага настаўніцкага жыцця прайшоў хутка і непрыкметна. Аднак неспатольная прага да ведаў, да пранікнення ў глыбіні нязведанага зноў прывяла Юзэфу Мацкевіч у студэнцкую аўдыторыю. Спачатку былі аднагадовыя падрыхтоўчыя курсы ў Магілёве для паступлення ў ВНУ (1933–1934 гг.), а потым – факультэт мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1934–1938 гг.). Старанную і здольную да навуковых даследаванняў студэнтку адразу заўважылі. Па заканчэнні інстытута ў 1938 г. па рэкамендацыі вядомага беларускага лінгвіста К. Гурскага Юзэфа Мацкевіч паступіла ў аспірантуру Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР. Пад кіраўніцтвам прафесара Я. Істрынай (Ленінград) яна спецыялізавалася па гісторыі беларускай мовы.

У другой палове чэрвеня 1941 г. Юзэфа Мацкевіч паехала ў Ленінград, каб падтрымаць мужа, які рыхтаваўся да абароны кандыдацкай дысертацыі, і пракансультавацца па ўласнай працы са сваім навуковым кіраўніком. Гадавалую дачку Наташу яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пакінула ў Мінску з пляменніцай мужа Марыяй, а трохгадовую Валю адвезла ў Віцебск да сваёй сястры, таксама Марыі. Тут, у Ленінградзе, Юзэфу Мацкевіч заспела вайна. З цяжкасцю яна ўладкавалася на цягнік, які ішоў на радзіму. Аднак пад Оршай цягнік разбамбілі нямецкія самалёты, і яна пешшу пайшла шукаць сваіх маленькіх дачушак. Спачатку накіравалася на радзіму мужа ў вёску Тупічын Касцюковіцкага раёна, дзе магла хавацца пляменніца мужа з дачкой Наташай, але іх там не было. Потым – пешшу ў Мінск. І зноў безвынікова. Праўда, суседзі падказалі, што яны могуць быць у Смалявічах, дзе жыў родны брат мужа Яфім Ганчароў. Юзэфа Мацкевіч пайшла ў Смалявічы і нарэшце знайшла сваю дачку Наташу, з якой усё ваеннае ліхалецце яны пражылі ў вёсцы Слабада Смалявіцкага раёна. Пакутлівыя пошукі дзяцей не прайшлі бясследна: трыццацігадовая жанчына пасівела.

Аднак, нягледзячы ні на што, як сапраўдны і шчыры патрыёт сваёй радзімы Юзэфа Мацкевіч не засталася ўбаку ад агульнанароднай барацьбы – яна стала сувязной партызанскай брыгады «Смерць фашызму» і Мінскай падпольнай партарганізацыі (варта падкрэсліць той факт, што згодна з паваеннымі анкетнымі дадзенымі яна ніколі не з'яўлялася ні камсамолкай, ні членам партыі). Менавіта небяспечная падпольная партызанская дзейнасць вымушала яе да частых змен месца жыхарства.

Пра лёс старэйшай дачкі Валі маці нічога не ведала да канца вайны. Дзяўчынку ўратавалі сястра Марыя з мужам, якія на час вайны перабраліся з Віцебска ў вёску Полымя Сенненскага раёна. Муж Юзэфы Мацкевіч у першыя ж дні вайны пайшоў у апалчэнне і ў верасні 1941 г. загінуў пад Ленінградам.

Адразу па заканчэнні вайны навукова-даследчыя ўстановы Акадэміі навук Беларусі пачалі аднаўляць і разгортваць сваю дзейнасць у Мінску. У маі 1945 г. Юзэфа Мацкевіч вярнулася ў разбураны горад і з радасцю прыняла запрашэнне Міхася Лынькова – тагачаснага дырэктара Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР на працу ў гэтую ўстанову. Паколькі навуковых кадраў катастрафічна не хапала, адначасова з працай у акадэмічнай установе яна па сумяшчальніцтве выкладае беларускую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мову ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. Горкага (1946–1954).

Галоўнай і тэрміновай задачай беларускіх лінгвістаў у першыя пасляваенныя гады стала ўкладанне «Руска-беларускага слоўніка» (апублікаваны ў 1953 г.). Для гэтага яшчэ на пачатку 1944 г. у Маскве была створана спецыяльная рабочая група пад кіраўніцтвам вядомага беларускага пісьменніка Пятра Глебкі, у якую ўваходзілі Міхаіл Суднік, Мікалай Лобан (на той момант – студэнт БДУ), Ніна Вайтовіч і іншыя пазней вядомыя дзеячы нацыянальнай культуры і навукі. Юзэфа Мацкевіч з уласцівым ёй энтузіязмам далучылася да гэтай складанай, адказнай і так неабходнай для краіны працы. Адначасова яна завяршала перапыненае вайной напісанне кандыдацкай дысертацыі «Літоўскі статут 1529 года як помнік беларускай літаратурнай мовы XV – пачатку XVI стагоддзя» і паспяхова абараніла яе ў 1946 г.

Неўзабаве на Беларусі пасля працяглага перапынку аднавіліся актыўныя дыялекталагічныя даследаванні, і гэтая лінгвістычная галіна стала асноўным аб'ектам навуковых інтарэсаў Юзэфы Мацкевіч, сапраўдным яе прызваннем, шчаслівым жыццёвым лёсам. Галоўным клопатам беларускіх дыялектолагаў першых паваенных гадоў стала найхутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё трывалых традыцый беларускай лінгвагеаграфіі – вядучай галіны дыялекталогіі беларускай мовы, надзейны падмурак якой заклаў яшчэ на зыходзе 1920-х гадоў Пятро Бузук. У ліку першачарговых і найважнейшых агульнанацыянальных задач было вызначана стварэнне «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (ДАБМ), для якога «папярэдняя праца па збіранню матэрыялаў... праводзілася Інстытутам мовы і літаратуры АН БССР, пачынаючы з 1938 г.» [2, с. 3].

З самага пачатку разгортвання работы па складанні атласа Юзэфа Мацкевіч з характэрнай для яе самааддананасцю, стараннасцю і выключнай працаздольнасцю ўключаецца ў гэтую справу. Яна прымае актыўны ўдзел у арганізацыі сістэматычнай, мэтанакіраванай і планамернай работы над лінгвагеаграфічным праектам. Для гэтага Ю. Мацкевіч разам з іншымі беларускімі дыялектолагамі наладжвала цесныя навуковыя сувязі з рускімі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

украінскімі вучонымі, прыцягвала і спецыяльна рыхтавала для збірання матэрыялаў выкладчыкаў мовы і аспірантаў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў рэспублікі, а таксама шырокае кола студэнтаў, настаўнікаў, аматараў роднай мовы, удзельнічала ў складанні метадычных дапаможнікаў для палявой дыялекталагічнай працы, праводзіла цэлы шэраг іншых навукова-арганізацыйных мерапрыемстваў. У 1949 г. яна разам з Марыяй Жыдовіч і Мікалаем Бірылам перапрацавала складзены ў 1947 г. Паўлам Растаргуевым праект праграмы па збіранні звестак для ДАБМ «з улікам недахопаў, выяўленых пры збіранні і апрацоўцы матэрыялаў, і ў адпаведнасці з тымі крытычнымі заўвагамі, якія былі выказаны маскоўскімі і ленінградскімі дыялектолагамі ў час абмеркавання праекта “Праграмы” на Першай дыялекталагічнай канферэнцыі ў 1948 г., а таксама на паседжанні сектара дыялекталогіі Інстытута рускай мовы ў Маскве» [2, с. 4].

У студзені 1950 г. Юзэфа Мацкевіч узначаліла сектар дыялекталогіі і стала адным з кіраўнікоў адказнай работы па стварэнні «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы», а фактычна і ўсіх дыялекталагічных даследаванняў на Беларусі.

Капітальная праца «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963 г.) – адно з найбуйнейшых навуковых здзяйсненняў беларускіх дыялектолагаў у паваенны час, вынік самаахвярнай дзейнасці вялікага калектыву айчынных навукоўцаў. Упершыню ў Савецкім Саюзе ў такія сціслыя часавыя тэрміны гэтая праца была паспяхова ажыццёўлена ў значнай ступені дзякуючы прыродным арганізатарскім здольнасцям, значным намаганням і асабістаму вялікаму творчаму ўдзелу Юзэфы Мацкевіч. Яна не шкадавала ні сіл, ні ўласнага часу, актыўна ўдзельнічала ва ўсіх тэарэтычных, метадычных і практычных работах па збіранні матэрыялаў і іх наступным абагульненні. Сумесна з членам-карэспандэнтам АН СССР Р. Аванесавым і акадэмікам АН БССР К. К. Атраховічам (Кандратам Крапівой) яна ажыццяўляла кіраўніцтва збіраннем звестак пра жывыя народныя гаворкі розных куткоў Беларусі, складала лінгвістычныя карты, займалася рэдагаваннем карт і матэрыялаў атласа іншых аўтараў, рыхтавала да выдання тэарэтычныя і даведачныя раздзелы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Арганічным працягам і папярэднім абагульненнем матэрыялаў «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» з'яўляецца наступная значная калектыўная праца айчынных дыялектолагаў – «Лінгвістычная геаграфія і групоўка гаворак беларускай мовы» (1968–1969 гг.), якая была падрыхтавана па ініцыятыве і пад навуковым кіраўніцтвам Рубена Аванесава, Кандрата Крапівы і Юзэфы Мацкевіч [1]. Тут у сінхранічным аспекце вызначаны ізаглосы, прааналізаваны і ахарактарызаваны шматлікія пучкі ізаглос, вызначаны іх склад і дынаміка, апісана паходжанне і развіццё асноўных з'яў фаналагічнай сістэмы, граматычнага ладу і лексічнага фонду беларускіх гаворак у іх узаемасувязі з рускімі і ўкраінскімі гаворкамі. Значная ўвага нададзена характарыстыцы групоўкі беларускіх гаворак, у складзе якіх вылучаны асноўныя дыялекты і групы, а таксама дыялектныя зоны, паказаны адрозненні паміж імі на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы. Асобны раздзел манаграфіі прысвечаны разгляду пытанняў генезісу дыялектаў беларускай мовы. У гэты ж час пад яе кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле разгортваюцца даследаванні структуры розных беларускіх гаворак, важнейшых фанетычных і граматычных асаблівасцей дыялектнай мовы.

Вышэйназваныя пасляваенныя дасягненні беларускіх дыялектолагаў сталі адметнай з'явай ва ўсім савецкім мовазнаўстве. Таму за комплекс прац «Беларуская лінгвістычная геаграфія» Юзэфе Мацкевіч у складзе аўтарскага калектыву ў 1971 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

Нягледзячы на вялікую занятасць лінгвагеаграфічнымі даследаваннямі, Юзэфа Мацкевіч разам з калегамі па працы падрыхтавала першыя грунтоўныя дапаможнікі для студэнтаў «Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі» (1962 г.) і «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964 г.). Акрамя таго, яна напісала больш за 80 іншых цікавых і змястоўных прац, у якіх аналізуюцца асаблівасці асноўных дыялектаў і паасобных груп гаворак беларускай дыялектнай мовы, разглядаюцца розныя складаныя пытанні яе сістэмы і інш.

На пачатку 1955 г. Юзэфа Мацкевіч была накіравана ў дактарантуру Інстытута мовазнаўства АН СССР (Масква), дзе на пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цягу двух гадоў (1955–1956) плённа працавала над манаграфіяй «Сістэма беларускага дзеяслова ў гаворках і ў літаратурнай мове», якая пазней была апублікавана пад назвай «Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове» (1959) і стала яе доктарскай дысертацыяй, паспяхова абароненай у 1963 г. У кнізе падрабязна прааналізаваны спосабы ўтварэння граматычных катэгорый і формаў спражэння дзеяслова, апісаны асобныя марфалагічныя варыянты ў дыялектах беларускай мовы і іх адлюстраванне ў мове мастацкай літаратуры.

У 1960 г. пад кіраўніцтвам Юзэфы Мацкевіч і пры яе самым актыўным удзеле пачалося збіранне беларускіх дыялектных матэрыялаў для складання «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа», выданне якога ажыццяўляецца з канца 1980-х гадоў у розных славянскіх краінах. Так, напрыклад, у 2000 г. у Мінску апублікаваны трэці выпуск лексічна-словаўтваральнай серыі атласа «Раслінны свет», падрыхтаваны да друку айчыннымі дыялектолагамі.

Як працяг і далейшае развіццё лінгвагеаграфічных даследаванняў на Беларусі ў 1970 г. у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР пад кіраўніцтвам Юзэфы Мацкевіч была распрацавана праграма па стварэнні «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (ЛАБНГ). У 1985 г. поўнасцю была завершана аўтарская праца над атласам, а ў 1998 г. і яго выданне. У закончаным выглядзе ЛАБНГ складаецца з пяці тамоў, дзе змешчана больш за 1800 карт з каментарыямі і даведачнымі матэрыяламі да іх, што даюць дакладнае ўяўленне пра пашырэнне і ўзаемаразмяшчэнне многіх дзясяткаў тысяч лексічных адзінак у гаворках Беларусі. У паасобных тамах карты згрупаваныя згодна з іх прадметна-тэматычнай накіраванасцю. Уважлівае прачытанне і асэнсаванне карт атласа мае важнае навукова-тэарэтычнае значэнне: дапамагае вырашаць пытанні пра шляхі, час, прычыны і ўмовы фармавання сучаснага дыялектнага ландшафту Беларусі, высвятляць месца і ролю ў працэсе ўзнікнення беларускага этнасу розных старажытных этнічных груп, што жылі ў мінулым на гэтай тэрыторыі, удакладняць шэраг спрэчных пытанняў сучаснага беларускага правапісу, з'яўляецца надзейнай крыніцай у выву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чэнні беларуска-іншамоўных кантактаў. Падобная праца створана на тэрыторыі былога СССР упершыню. У 2000 г. аўтарскі калектыў на чале з Ю. Мацкевіч за «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь у галіне фундаментальных навуковых даследаванняў.

З 1960-х гадоў па завяршэнні працы над «Дыялекталагічным атласам беларускай мовы» навуковыя даследаванні беларускай дыялектнай мовы ўсё больш пачалі скіроўвацца на вывучэнне лексічнага складу народных гаворак, у чым вялікая асабістая заслуга Юзэфы Мацкевіч. У штогадовых дыялекталагічных экспедыцыях яна сабрала велізарны лексічны матэрыял, які быў пакладзены ў аснову даўно задуманага ёй «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» [3]. Гэта самая буйная ў айчыннай дыялектнай лексікаграфіі пяцітомная праца (больш за 38 тысяч слоўнікавых артыкулаў) з'яўляецца наступным крокам у беларускай рэгіянальнай лексікаграфіі. Навізна слоўніка ў тым, што ў ім упершыню прадстаўлена лексіка буйной тэрытарыяльнай адзінкі — дыялектнай зоны. Акрамя таго, у слоўніку пазначаны паралелі з іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі, прыведзены цікавыя этнаграфічныя заўвагі, параўнанні, народныя фразеалагізмы і інш. У працы сістэматызаваны вялікі фактычны матэрыял жывой народнай мовы, які з'яўляецца надзейнай базай для стварэння ў будучым поўнага слоўніка беларускіх народных гаворак, крыніцай далейшага вывучэння гісторыі і дыялекталогіі беларускай мовы.

Як буйнейшы і вядомы спецыяліст па беларускай дыялекталогіі, умелы арганізатар навукова-даследчай работы і аўтар шматлікіх і грунтоўных прац Юзэфа Мацкевіч у 1969 г. першай з супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства ў пасляваенны час была абрана членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР, а ў 1978 г. ёй прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР. Грамадская і навуковая дзейнасць Юзэфы Мацкевіч адзначана і высокімі ўрадавымі ўзнагародамі: ордэнам Дружбы народаў, медалём «За доблесную працу», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Толькі ў 1991 г. яна пакінула актыўную навуковую дзейнасць і пайшла на заслужаны адпачынак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аднак і тады не парывала сувязі са сваімі калегамі, пастаянна цікавілася справамі ў родным аддзеле, праблемамі і поспехамі сваіх маладзейшых калег.

Не стала Юзэфы Мацкевіч 11 лістапада 2003 г. Аднак засталіся яе грунтоўныя навуковыя артыкулы, лінгвістычныя атласы, дыялектныя слоўнікі, што заўсёды будуць узорам для новых пакаленняў беларускіх мовазнаўцаў. Засталіся шматлікія вучні, якія ніколі не перастануць захапляцца яе велізарнай працавітасцю, жыццёвай мудрасцю, чалавечай мужнасцю, дабрынёй і спагадлівасцю.

### Літаратура

1. Лінгвістычная геаграфія і групоўка гаворак беларускай мовы / пад рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы), Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968–1969.

2. Праграма па вывучэнню беларускіх гаворак і збіранню звестак для складання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы / укл. М. В. Бірыла, М. А. Жыдовіч, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : АН БССР, 1950. – 112 с.

3. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / уклад.: Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.] ; пад рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986. – Т. 1–5.

## ЛЕАНІД ПАДГАЙСКІ

Леанід Пракопавіч Падгайскі нарадзіўся 25 лістапада 1934 г. у Ленінградзе. Яго бацька Пракоп Канстанцінавіч працаваў кухарам, а маці Марыя Ягораўна – кандуктарам грамадскага транспарту. Праз год пасля нараджэння Леаніда сям'я пераехала на сваю малую радзіму ў горад Мсціслаў. Там жа, працуючы на зямлі, Марыя Ягораўна з сынам і малодшай дачкой Лідзіяй перажылі нямецкую акупацыю.

У 1942 г. Леанід Падгайскі пачаў вучыцца ў Зарачанскай пачатковай школе, пазней перайшоў у сярэднюю школу № 1 г. Мсціслава, па заканчэнні якой паступіў у Мсціслаўскае педвучылішча. Леанід вучыўся ахвотна і лёгка, шмат чытаў, атрымліваючы задавальненне ад набыцця новых ведаў. Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, ён быў залічаны на курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў матэматыкі для 5–7 класаў пры Аршанскім настаўніцкім інстытуце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ